УДК 902.2:069.4]:336.055.2

*Н. А. Пачобут*

# Валарызацыя аб'екта археалагічнай спадчыны на прыкладзе замка Беразавец. Прапановы па музеефікацыі

*На канкрэтным прыкладзе раскрываецца сутнасць працэсу ацэнкі гісторыка-культурнай каштоўнасці аб'екта археалагічнай спадчыны як першапачатковага этапу яго музеефікацыі. Адлюстраваны працэс і вынікі валарызацыі гарадзішча Беразавец, якое ў XVI ст. функцыянавала ў якасці прыватнага драўлянага замка Вялікага Княства Літоўскага, уладання роду пана Кміты Стратовіча. Валарызацыя помніка праведзена ўпершыню. Аўтарам прапанавана неінвазіўная музеефікацыя замка. Робіцца выснова, што аб'екты археалагічнай спадчыны катэгорыі «3» у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь вымагаюць ацэнкі іх каштоўнасці для сучаснай культуры, што дае магчымасць праводзіць мерапрыемствы па музеефікацыі.*

Археалагічная спадчына – гэта матэрыяльныя рэшткі існавання творчай або разбуральнай дзейнасці чалавека. Яна ўключае ў сябе як месцы з нерухомымі аб'ектамі, прычым яны часта знаходзяцца пад слоем зямлі або вады, так і асобныя рухомыя прадметы.

У святле «Міжнароднай хартыі па ахове і выкарыстанні археалагічнай спадчыны» 1990 г. археалагічная спадчына разглядаецца як частка «матэрыяльнай спадчыны, інфармацыя аб якой можа быць атрымана археалагічнымі метадамі. Яна ахоплівае ўсе сляды чалавечага існавання і складаецца з месцаў, звязаных з усімі сведчаннямі чалавечай дзейнасці, сярод якіх збудаванні і разнастайныя рэшткі (у тым ліку аб'екты падземныя і падводныя) разам з усім рухомым культурным матэрыялам, з імі звязаным» [16].

У адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры ахова археалагічнай спадчыны з'яўляецца напрамкам культурнай дзейнасці, які ўключае сістэму мер (арганізацыйных, прававых, эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, навуковых, інфармацыйных і інш.) [1, арт. 124, п. 1].

У наш час значнасць археалагічнай спадчыны асэнсоўваецца і для культуралагічнага даследавання сучаснасці. Цікавасць даследчыкаў накіравана не толькі на рэшткі дагістарычнага часу або Сярэдневякоўя, але і на аб'екты, якія маюць узрост крыху большы за 100 гадоў. Галоўнае, каб яны вылучаліся з існуючай сацыяльна-культурнай сістэмы [21, S. 59].

Абгрунтаванне неабходнасці аховы і кансервацыі археалагічных помнікаў адсылае да іх каштоўнасці, захаванасці. Вызначэнне гісторыка-культурнай каштоўнасці праводзіцца пасля ідэнтыфікацыі помніка,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у аснову якой пакладзены даныя палявых археалагічных даследаванняў. У выніку параўнаўча-тыпалагічнага аналізу аб'ект адносіцца да пэўнага віду помніка з указаннем культурнай прыналежнасці, перыядызацыі і храналогіі.

З мэтай вызначэння каштоўнасці археалагічнага аб'екта ў больш шырокім сэнсе варта звярнуць увагу на такія аспекты, як ступень захаванасці рэшткаў старажытнага грамадства, наяўнасць вартасцей з пункту гледжання навуковых даследаванняў, захаванасць культурнага ландшафту [22, S. 111–115]. Без вызначэння каштоўнасці аб'екта далейшае захаванне і выкарыстанне помніка, а тым больш распрацоўка рэстаўрацыйных дырэктыў, будуць праблематычнымі. Звяртаецца ўвага на наяўнасць у аб'екта вартасцей з пункту гледжання дыдактычнай карыснасці, эмацыянальнага ўздзеяння, падкрэсліваецца мастацка-эстэтычная каштоўнасць. Грамадства даўно ацаніла эканамічнае значэнне археалагічнай спадчыны, таму што будучы важным складнікам культурнага патэнцыялу краіны, яна можа быць асновай для развіцця турызму [21, S. 59].

Варта звярнуць увагу на такі факт, што рэсурс археалагічнай спадчыны часовы, ён падвяргаецца разбурэнню ў выніку дзейнасці сіл прыроды і чалавека. Улічваючы тое, што археалагічны аб'ект з'яўляецца грамадскім здабыткам, важна стварыць вакол яго ахоўныя зоны, зрабіць усё неабходнае, каб распаўсюджваць веды аб ім, як аб іншых помніках гісторыі і культуры, падкрэсліваць яго адметную каштоўнасць.

У дадзеным кантэксце адлюстраваны працэс і вынікі валарызацыі (фр. valorization ад valoir – ацэньваць, падыходзіць) аднаго з унікальных помнікаў археалогіі Беларусі – гарадзішча Беразавец (Карэліцкі раён). Валарызацыя была праведзена на падставе пісьмовых крыніц XVI – першай паловы XVII ст. з улікам даных археалагічных даследаванняў. Этапамі валарызацыі помніка з'яўляюцца: 1) канкрэтызацыя; 2) вывучэнне гісторыі даследавання; 3) аналіз гістарычных крыніц; 4) стварэнне іерархіі даных з пункту гледжання захаваных элементаў аб'екта, акаляючага асяроддзя і ландшафту; 5) вызначэнне гістарычнай каштоўнасці ў нацыянальным маштабе; 6) суаднясенне выяўленых гістарычных крыніц і захаванасці культурнага пласта або матэрыяльнай формы аб'екта; 7) параўнаўчы аналіз з помнікамі, блізкімі па храналогіі і культурнай інтэрпрэтацыі.

Аб'ект нашага даследавання гарадзішча Беразавец размешчаны каля в. Беразавец Турэцкага с/с, на левым беразе р. Сэрвач (прыток Нёмана), за 5 км на поўдзень ад г. п. Карэлічы [15, с. 2]. У 20 км ад яго знаходзіцца Мірскі замак. Пляцоўка гарадзішча мае форму, набліжаную да прамавугольніка, схілы стромкія. Часткова захаваліся абарончыя роў і вал. Гарадзішча зарэгістравана ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь у 2007 г. пад шыфрам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

413В000315 з катэгорыяй «3», храналогія помніка – 1 тыс. н. э.; X–XIII–XVI–XVII стст.

Аб наяўнасці гарадзішча ўпершыню напісаў спецыяліст па ахове помнікаў В. С. Астапаў у 1951–1952 гг. [2], абмеры зрабіў археолаг У. Ф. Ісаенка ў 1974 г. [8]. Помнік увайшоў у навуковую літаратуру і «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць» (1986). Першасная яго ідэнтыфікацыя паказала, што каля в. Беразавец існуе гарадзішча, датаванне якога максімальна шырокае – ад жалезнага веку да позняга Сярэдневякоўя. Падставай для правядзення больш глыбокай ідэнтыфікацыі паслужылі вусная гісторыя вёскі і археалагічныя раскопкі (з 2013 г.). У 2012 г. са слоў 89-гадовай жыхаркі в. Беразавец М. І. Сянюты было запісана мясцовае паданне аб замку князя Кміты, што стаяў на гарадзішчы. У 2013 г. на гарадзішчы быў выяўлены на паўночным краі помніка культурны пласт магутнасцю 2,6 м [14]. Раскопкі на замку і селішчы з поўдня працягваліся ў 2014–2015 гг., 2018 г. У выніку быў атрыманы каштоўны матэрыял па культуры XVI–XVII стст.

Беларускім рэспубліканскім фондам фундаментальных даследаванняў у 2014–2015 гг. у рамках праекта «Даследаванне археалагічнага комплексу Беразавец: замак і двор роду Кміты» ажыццяўляліся пошук і аналіз корпуса крыніц па гісторыі паселішча Беразавец і генеалогіі гаспадароў маёнтка [12; 13]. Найбольш важнымі для вывучэння гарадзішча з'яўляюцца крыніцы па гісторыі замка («Оповедание пана Ивана Кмиты Берозовецкого к погореню листовъ привилевъ и твердостей на именья в замъку Берозовецкомъ» 1562 г. [11], інвентар Лаўрышаўскага манастыра 1601 г. [7]); генеалагічныя даследаванні К. Нясецкага [18], А. Банецкага [17]; акты XVI ст. Літоўскай метрыкі (кнігі судовых спраў і інш.) [10; 5]; інвентары фальварка Беразавец за 1636 г. [20], 1639 г. [19], маёнтка Беразавец за 1681 г. [6].

З аповеду [11] вядома, што ў XVI ст. існаваў замак Беразавец, які быў спадчынным уладаннем Кмітаў-Стратовічаў з XV ст. Дзед Івана Кміты атрымаў ад вялікага князя Казіміра Ягайлавіча маёнтак Беразавец, а ў 1562 г. у замку адбыўся вялікі пажар. Як распавядаў пан Кміта Беразавецкі, «замокъ Березовец зо всею маетностью, з листы, с привилеями, с потверженьями господаръскими згорел. <…> згорел ему лист славное памети короля его милости Казимира данный деду его на Березовеци на Узду, лист на Почеповъ, на Чую… » [Там жа, л. 383 адв.].

Вядомы мясцовы род паноў Кмітаў-Стратовічаў з Навагрудскага павета меў значныя зямельныя наданні ад Вітаўта Вялікага і дынастыі Ягелонаў. Гісторык А. Банецкі выводзіў паходжанне роду ад Стрэта, які быў «гараднічым» у Троках у 1491 г.

Прадстаўнікі роду Стратовічаў асобна «стаялі» ад вядомых дынастый у ВКЛ і Польшчы [17, S. 189]. Яны згадваюцца ў актах Літоўскай метрыкі ў пачатку XVI ст. Кміта Стратовіч завецца панам і суддзёй у тэкстах



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакументаў кніг судовых спраў (1514–1516 гг.) [10, т. 1, кн. II, с. 852–855]. Найбольш старажытная з выяўленых па тэме крыніц датуецца 1511 г. Гэта загад караля Жыгімонта I панам-радзе, каб яны вырашылі спрэчку Настассі Слуцкай і Кміты, якая ўзнікла ў ходзе размежавання зямельных уладанняў [Там жа, с. 698–700].

У захаваным дакуменце (1522) з радаводам Кмітаў-Стратовічаў гаворыцца, што бацькам Кміты Беразавецкага быў Стрэт, а дзедам Васілій [4, с. 1120]. Замак Кміты Стратовіча пасля яго смерці наследаваў сын Іван (Ян) Кміта, «дваранін гаспадарскі» (1551). Іван Кміта згадваецца ў пастанове маршалкоўскага суда 1541 г. па іску Храптовічаў, а таксама як сведка на судовых разбіральніцтвах.

Прадстаўнікі роду Кмітаў вядомы сярод фундатараў Лаўрышаўскага манастыра, але ў 90-я гг. XVI ст. зафіксаваны маёмасныя спрэчкі Кмітаў з манастыром [7; 12, с. 24–25; 17, S. 190]. Дакументы Літоўскай метрыкі дазволілі высветліць сямейныя сувязі ўласнікаў замка з прадстаўнікамі знаці ВКЛ: Солтанамі, Прыхабскімі, Вяземскімі, Вішнявецкімі, Крашынскімі, Валовічамі. Было ўстаноўлена існаванне двух суседніх маёнткаў з назвай Беразавец, адзін з якіх належаў падскарбіям Солтанам [9, с. 26], а другі, разам з замкам Беразавец, – панам Кмітам-Стратовічам.

Інфармацыя аб фартыфікацыі і цывільнай забудове замка была атрымана ў ходзе вывучэння інвентароў 1636, 1639 гг. [20; 19]. У 1636 г. фальварак Беразавец быў набыты навагрудскім ваяводам Жыгімонтам Каралем Радзівілам, чацвёртым Нясвіжскім ардынатам, у сувязі з чым і была пераўлічана беразавецкая маёмасць [12, с. 27–28].

На той час замак меў тры вежы, часткова захаваліся абарончыя сцены, складзеныя ў розных тэхніках; будаўнічым матэрыялам служыла дрэва. Уязная брама размяшчалася з захаду, трапіць у замак можна было толькі з суседняга пагорка праз мост. У інвентарах даюцца дастаткова падрабязныя апісанні будынкаў. У 30-я гг. XVII ст. на тэрыторыі замкавага двара размяшчаліся царква, тры дамы, будынкі сталовай, кухні і піўніцы. Зафіксаваны шматлікія пашкоджанні жылых пабудоў, ёсць звесткі аб рамонтных работах, якія адбыліся напярэдадні продажу. Жыццё ў замку канчаткова спынілася, відавочна, пасля заўчаснай смерці ў 1642 г. Ж. Радзівіла. З 1681 г. месца былога замка называлася старым замчышчам [6].

Звернем увагу, якія з элементаў археалагічнага аб'екта добра захаваліся. Найперш, форма і вышыня (10 м) гарадзішча, абрысы прамавугольнай замкавай пляцоўкі з закругленымі вугламі (90 х 45 м), таксама глыбокі абарончы роў з заходняга боку, рэшткі абарончага вала па краі пляцоўкі гарадзішча (вышынёй да 1 м) [3]. На жаль, культурны пласт у цэнтры пляцоўкі гарадзішча быў знішчаны. Падчас Першай сусветнай вайны пляцоўка археалагічнага помніка пашкоджана глыбокімі ямамі (лінія фронту праходзіла па р. Сэрвач і на гарадзішчы размяшчаўся

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

нямецкі агнявы пункт, у 500 м, на тэрыторыі в. Беразавец, знаходзіліся рускія пазіцыі).

Гэты гістарычны факт сведчыць аб існуючай праблеме – наўмысным знішчэнні помнікаў культуры. З пункту гледжання навакольнага асяроддзя аб'ект удала ўпісаны ў ландшафт. Узвышаецца над поймай р. Сэрвач, з усходу і поўдня знаходзіцца даліна ракі, а з поўначы працякае р. Неўда. Помнік акружаны палямі. З замчышча, размешчаным на высокім узгорку, адкрываецца вельмі прыгожы краявід на суседнія вёскі. Старое рэчышча Сэрвачы, якое першапачаткова знаходзілася паблізу гарадзішча, у выніку меліярацыі апынулася ў 350 м ад яго, побач з в. Беразавец. З цягам часу зніклі тры сажалкі каля паўночнага і ўсходняга схілаў замка, а таксама маленькая р. Палушка пры замку, вядомыя з тэкстаў інвентароў. Захаваліся старажытныя дарогі, якія злучалі замак з Крынкамі і Беразаўцом.

Гарадзішча Беразавец – помнік атракцыйны (прыцягвае ўвагу памерам і формай), эстэтычна прывабны ў летнюю пару. Ён аказвае эмацыянальнае ўздзеянне, таму што вылучаецца з акаляючага ландшафту.

Як ні парадаксальна, але падчас войнаў помнікі археалогіі, найперш гарадзішчы, прыстасоўваліся пад ваенныя аб'екты. Гэта характэрна і для Беразавецкага гарадзішча, якое на сённяшні дзень захоўвае сляды разбуральнага ўздзеяння сусветнага ваеннага канфлікту на тэрыторыі краю.

Звернем увагу на такую з'яву як экспертная ацэнка. У нацыянальным маштабе яна ўлічвае тры ступені каштоўнасці: 1) помнік мае значэнне ў гісторыі дзяржавы; 2) у гісторыі рэгіёна; 3) у мясцовай гісторыі. На думку даследчыкаў, драўляны прыватнаўласніцкі замак Беразавец, датаваны XVI – 1-й пал. XVII ст., адпавядае 2-й ступені каштоўнасці і вельмі важны ў кантэксце рэгіянальнай гісторыі Верхняга Панямоння, Навагрудскага ваяводства.

На наш погляд, суадносіны выяўленых гістарычных крыніц і наяўнасці інфарматыўнага культурнага пласта ў помніках археалогіі можна ацэньваць паводле чатырох ступеней каштоўнасці (S – плошча помніка):

1. Захаваўся культурны пласт (на S > за 50 %) і гістарычны матэрыял;
2. Захаваўся культурны пласт (на S < за 50 %) і гістарычны матэрыял;
3. Захаваўся культурны пласт (на S < за 50 %), гістарычны матэрыял не захаваўся;
4. Культурны пласт амаль поўнасцю знішчаны, гістарычны матэрыял не захаваўся.

Гарадзішча Беразавец адносіцца да другой ступені каштоўнасці па абраных крытэрыях.

Помнік археалогіі вызначаецца сярод падобных драўляных прыватнаўласніцкіх замкаў ВКЛ Новага часу, якія размяшчаліся не ў га-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

радах і не з'яўляліся буйнымі рэзідэнцыямі магнатаў, такіх як Ракаўскі, Магільнянскі, Горвальскі, Гарадок (Астрашыцкі гарадок), Мышкоўскі. Гэта невялікая група помнікаў, што амаль не захавалі культурны пласт або ўжо не чытаюцца ў сучаснай ландшафтнай сітуацыі. Замак і двор Беразавец, разглядаемыя як археалагічны комплекс, безумоўна, маюць вялікую навуковую каштоўнасць.

Адзначым, што ў археалогіі Беларусі фактычна не распрацоўваецца тэма сельскіх драўляных прыватнаўласніцкіх замкаў XV–XVII стст. Матэрыяльная культура сельскіх паселішчаў перыяду ВКЛ, за выключэннем Лучна ў Полацкім раёне, таксама слаба даследавана. Раскопкі ў 2014–2015 гг. на тэрыторыі феадальнага двара Беразавец, побач з замкам, далі выдатны археалагічны і астэалагічны матэрыял [12; 13]. У параўнанні з іншымі замкамі, культурны пласт на гэтым помніку не быў разбураны будаўніцтвам XVIII–XIX стст., вельмі добра чытаецца стратыграфія, дакладна вызначаюцца два будаўнічыя ярусы (першы – канца XV – сярэдзіны XVI ст., другі – канца XVI – 1-й паловы XVII ст.). Атрыманы выдатныя калекцыі посуду і пячной кафлі, узоры зброі, упрыгажэнняў, калекцыя манет. Адкрыты рэшткі некалькіх пабудоў. Матэрыялы з селішча і гарадзішча адлюстроўваюць бытавую культуру, заняткі насельніцтва, культуру харчавання, распаўсюджанне інавацый у матэрыяльнай культуры Беларусі, якія ішлі з вялікакняжацкай рэзідэнцыі ў Вільні і з Усходняй Еўропы, гандлёвыя сувязі.

Інфармаванне мясцовага грамадства (у тым ліку праз СМІ) аб гісторыка-культурнай каштоўнасці аб'екта, унікальнасці яго для навукі, змяніла адносіны да помніка, адным з доказаў чаго стала перанясенне святкавання Купалля ў іншае месца. Спрацаваў каштоўнасны падыход – і абыякавае стаўленне да гарадзішча, якое не мае культурнай прыналежнасці, змянілася на паважлівыя адносіны да былога драўлянага замка часоў Вялікага Княства Літоўскага Кмітаў-Стратовічаў, што былі гаспадарамі сучасных Крынак, Беразаўца, Пачапава больш за 400–500 гадоў таму. Праведзеная валарызацыя паказала, што ў Карэліцкім раёне захаваўся каштоўны з пункту гледжання гісторыка-культурнага ландшафту рэгіёна аб'ект.

Беразавецкі помнік археалогіі можа стаць сведчаннем рэгіянальнай культурнай ідэнтычнасці і патрабуе распрацоўкі прапаноў па далейшай актуалізацыі аб'екта ў сучаснай культурнай прасторы. Стварэнне на помніку мадэлі замка або рэканструкцый асобных элементаў непрымальна з-за складанасці навуковай інтэрпрэтацыі наратыўных крыніц. Негатыўным наступствам рэканструкцый на помніках з'яўляецца і частковае разбурэнне культурных напластаванняў, стварэнне значных абмежаванняў для правядзення археалагічных раскопак і выкарыстання геафізічных метадаў даследавання. Таму найбольш прымальнай фор-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

май актуалізацыі гісторыка-культурнай каштоўнасці ў святле здзейсненай валарызацыі лічым неінвазіўную музеефікацыю (тэрмін аўтара; ад англ. non-invasive – неагрэсіўны) шляхам распрацоўкі 3D-мадэлі візуалізацыі замка з размяшчэннем у інтэрнэт-прасторы (на сайтах Музея «Замкавы комплекс "Мір"», УК «Карэліцкі раённы краязнаўчы музей»). Візуалізацыя помніка на перыяд XVI ст. будзе падтрымана кантэнтам з віртуальна экспануемымі артэфактамі, навуковымі і папулярнымі тэкстамі, аператыўнай інфармацыяй аб даследаваннях. У выніку праведзенай аэрафотаздымкі замчышча распрацоўваюцца мадэлі асноўных аб'ектаў забудовы былога замка на падставе наратыўных крыніц для музеефікацыі.

Культуралагічная валарызацыя помніка археалогіі гарадзішча «Замак Беразавец» дазволіла выявіць яго культурна-гістарычную, навуковую і эмацыянальна-сімвалічную каштоўнасці. Важна падкрэсліць, што здзейсненая валарызацыя з'яўляецца абгрунтаваннем неабходнасці працягу пачатай работы па неінвазіўнай музеефікацыі былога замка Беразавец.

*1.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронны рэсурс] : 20 ліп. 2016 г., № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. // Нац. прававы інтэрнэт-партал Рэсп. Беларусь . – Рэжым доступу: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413&p1=1.doc. – Дата доступу: 26.02.2021.

*2.* *Астапов, В. С.* Дневники. 1951–1952 гг. // Цэнтральны навук. архіў НАН Беларусі. – Фонд археал. навук. дакументацыі Ін-та гісторыі. Воп. 1. Спр. 74–76.

*3.* В. Беразавец, Турэцкі сельскі савет // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць / Акадэмія навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Беларус. Сав. Энцыкл. – Мінск, 1986. – С. 210.

*4.* Вастанаўленне ў правах шляхецкіх баяр Любецкіх Першка і Андрэя Ігнатовічаў і Паўла і Пятра Яцковічаў у павеце Навагрудскім, 16.06.1522 г. // Литовская метрика. – Петерб. : Изд. Импер. Археограф. Комиссии, 1903. – Т. I, кн. II. № 394. – С. 1120–1122.

*5.* Данная Ивана Стретовича Лаврашеву монастырю на тридцать коп жита // Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. – Т. 1. – СПб., 1863. – С. 295.

*6.* Інвентар маёнтка Беразавец Навагрудскага павету, 1681 г. // Нац. гіст. архіў Беларусі. – Ф. КМФ-5. Воп. 1. Спр. 82. Л. 2–4 адв.

*7.* Инъвенътаръ албо списаніе монастира Лавришовского, 1601 г. // Нац. гіст. архіў Беларусі. – Ф. 147. Воп. 2. Спр. 175. Л. 1732–1733.

*8.* *Исаенко, В. Ф.* Отчет о полевых работах и обследованиях 1974 года на территории Полесья и Гродненской области, Минск, 1975 / В. Ф. Исаенко // ЦНА НАН Беларусі. – Фонд археал. навук. дакументацыі Ін-та гісторыі. Воп. 1. Спр. 475. – 14 с.

*9.* Копія духовнаго завъщанія Ивана Андреевича Солтана. 1554 г. августа 24 // Археографический сб. документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Т. I–XIII. – Вильна, 1867–1904. – Т. IV. – С. 25–28.

*10.* Литовская метрика. Т. 1. : Книги судных дел [Электронный ресурс] // Русская ист. б-ка. Т. 20. – Петерб. : Изд. Импер. Археографической Комиссии, 1903. – Книги I–III. – С. 355–1444. – Режим доступа: https://www.elib.bsu.by/handl/123456789/80.pdf. – Дата доступа: 26.02.2020.

*11.* Оповедание пана Ивана Кмиты Берозовецкого к погореню листовъ привилевъ и твердостей на именья в замъку Берозовецкомъ // Нац. ист. архив Беларуси. – Ф. КМФ–18. Оп. 1. Д. 255. Л. 383–383 об.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12. Пачобут, Н. А.* Аб археалагічных раскопках селішча Беразавец у Карэліцкім раёне ў 2014 г., Гродна, 2015 / Н. А. Пачобут, Л. У. Калядзінскі // ЦНА НАН Беларусі. – Фонд археал. навук. дакументацыі Ін-та гісторыі. Воп. 1. Спр. 3200. – 120 с.

*13. Пачобут, Н. А.* Аб правядзенні археалагічных раскопак гарадзішча і селішча Беразавец на тэрыторыі Карэліцкага раёна (гісторыка-культурнай каштоўнасці 413В000315) у 2015 г., Гродна – 2017 / Н. А. Пачобут, Л. У. Калядзінскі // ЦНА НАН Беларусі. – Фонд археал. дакументацыі Ін-та гісторыі. Воп. 1. Спр. 3411. – 222 с.

*14. Пачобут, Н. А.* Археалагічныя даследаванні замка Кміты ў 2013 г. / Н. А. Пачобут // Краязнаўчыя запіскі : зб. арт. / Упраўленне культуры Гродзен. аблвыканкама, Гродзен. дзярж. археал. музей ; рэдкал. : Р. В. Янчалоўская [і інш.]. – Гродна, 2013. – Вып. 9 – С. 132–141.

*15. Пачобут, Н. А.* Справаздача аб археалагічных раскопках гарадзішча Беразавец у Карэліцкім раёне ў 2013 г., Гродна – 2014 / Н. А. Пачобут, Л. У. Калядзінскі // ЦНА НАН Беларусі. – Фонд археал. навук. дакументацыі Ін-та гісторыі. Воп. 1. Спр. 3154. – 77 с.

*16.* Charter for the Protection and Management of the Archaeological Heritage (1990) [Electronic resource] // ICOMOS. – Mode of access: // https://www.nid.pl/upload/iblock/195/19562c9b368d5af7af53c19c7aeb9a37.pdf. – Date of access: 26.11.2020.

*17.* Herbarz polski / ułożył i wydał Adam Boniecki. – Warszawa, 1907. – T. X. – Cz. 1: Wiadomości historyczno-genealogiczne o rodach szlacheckich. – S. 189–190.

*18.* Herbarz polski Kaspra Niesieckiego S. J. Powiększony dodatkami późniejszych autorów, rękopismów, dowodów urzędowych. – Lipsk, 1841. – T. VIII. – S. 75, 122–129.

*19.* Inwentarz majętności Berezowieckiej w Woiewodztwie Nowogrodzkim leżącej (inwentarz folwarku Berezowca 2 października 1639 r.) // Archiwum Główne Akt Dawnych. – F. AR. Dz. XXV. Nr. 102. – 32 S.

*20.* Inwentarzy Folwarku Berezowca 1636 r. // Archiwum Główne Akt Dawnych. – F. Archiwum Radziwiłłów (AR). Dz. XXV. Nr.101. – 101 S.

*21. Kobyliński, Z.* Teoretychne podstawy konserwacji dziedzictwa archeologicznego / Z. Kobyliński. – Warszawa, 2001. – S. 59–97.

*22.* Ochrona Wartości Krajobrazu i Środowiska Kulturowego w Studium do Planu i miejscowym Planie Zagospodarowania Przestrzennego / Michałowski A. (red.) ; Narodowa Instytucja Kultury // Studia i Materiały. Krajobrazy. – № 18 (30). – Warszawa : Ośrodok ochrony zabytkowego krajobrazu, 1998. – 186 S.

*N. Pachobut*

**Valorization of an archaeological heritage site on the example of Berezovets Castle. Museumification proposals**

*Using a particular example, the essence of the process of assessing the historical and cultural value of an archaeological heritage object as the initial stage of its museumification is revealed. The process and results of the valorization of the Berezovets settlement, which in the XVIIth century functioned as a private wooden castle of the Grand Duchy of Lithuania, the possession of the family of Pan Kmita Stratovich, are reflected. The valorization of the monument is carried out for the first time. The non-invasive museumification of Berezovets Castle is proposed by the author. It is concluded that the objects of the archaeological heritage of category «3» in the State List of Historical and Cultural Values of the Republic of Belarus require an assessment of their value for modern culture, that makes it possible to carry out museumification activities.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 10.12.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ